**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за кастрычнік 2020 г.**

## Мерапрыемствы ў рамках абласнога месячніка міласэрнасці

**1 кастрычніка**

У Міжнародны дзень пажылых людзей бібліятэкары аддзела абслугоўвання і інфармацыі правялі акцыю "З павагай і удзячнасцю", у час якой павіншавалі са святам сталае пакаленне чытачоў, уручалі прыгожыя паштоўкі і бясплатна выдавалі кніжныя навінкі з камерцыйнага фонду.

ЦРБ, 37 чал.

**2 кастрычніка**

На бібліятэчныя вячоркі «А года как строчки в песне» сабраліся за святочным сталом самыя актыўныя чытачы сталага веку.

Бібліятэкар расказала пра гісторыю свята, правяла віктарыну па фільмах, конкурсы на кемлівасць. Удзельнікі чыталі вершы, спявалі песні, разгадвалі загадкі пра пажылых людзей. Аформлена рэтра-выстава «Книги трёх поколений». Прадстаўнік Кобрынскага ТЦСАН уручыў падарункі ад хлебазавода і масласырзавода.

Дзівінскі філіял, 23 чал.

**10 кастрычніка**

Бібліятэкары запрасілі пажылых жыхароў аграгарадка на вечар-сустрэчу «Як перш патрэбныя і любімыя». Удзельнікі ЛПГ «Натхненне» у паэтычнай форме павіталі гасцей, выказалі словы падзякі за іх шматгадовую працу, мудрасць і дабрыню. Госці з задавальненнем праслухалі музычныя нумары, прынялі ўдзел у конкурсе «Узгадай і заспявай» і віктарыне аб прадметах народнага побыту.

Гарадзецкі філіял, 25 чел.

## Мерапрыемствы да Дня маці

**11 кастрычніка**

Бібліятэкар арганізавала літаратурна-музычную гасцёўню «Прекрасен мир любовью материнской» для ўсіх матуль і бабуль вёскі. Праведзена віншаванне Кудраўцавай Наталлі, якая выхоўвае 5 дзяўчынак. Аўдзяюк Даша і Камяльчук Яўген чыталі вершы. Вучні малодшых класаў паказалі сцэнкі «Что за дети нынче, право?», «Мой сынок», «Вавановна и Петровна». Пераможцы святочных конкурсаў атрымалі званні «Мисс Уют», «Мисс Забота», «Мисс Гостеприимство», «Мисс Эрудиция». Прадстаўлена кніжная выстава «Жанчына. Маці. Каханне. Свет» .

Шамятоўская ПБ, 30 чал.

**14 кастрычніка**

Бібліятэка размясціла зале Дома культуры шэсць выстаў і дзве фатазоны. Жыхары вёскі змаглі зрабіць эфектныя фатаграфіі і нацешыцца прыгажосцю дзіцячай творчасці на выставе вырабаў «Все краски жизни для тебя», малюнкаў «Краски осени», кніжных выставах «Женская судьба в книжном переплете», «Мой ангел-мама» і фотавыставе «Ты одна такая, любимая, родная…».

Падчас правядзення акцыі «Не забудь поздравить маму» дзеці займаліся вырабам сувеніраў, дэкламавалі святочныя вершы, спявалі песні. Пад канец мерапрыемства кожная мама атрымала сваё віншаванне па сацыяльным сеткам.

Батчынская ПБ, 62 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**8 кастрычніка**

Напярэдадні прафесійнага свята - Дня работнікаў культуры - цэнтральная раённая бібліятэка ў ліку пераможцаў абласнога конкурсу па стварэнні віртуальных праектаў краязнаўчай тэматыкі. Скарбонка ўзнагарод за краязнаўчую работу, шматаспектную даследчую дзейнасць папоўнілася яшчэ адным дыпломам.

ЦРБ

**15 кастрычніка**

На пасяджэнні аматарскага клуба «Экоша» адбылося літаратурнае свята «Осень, рыжая подружка». Арганізавана выстава «Краски осени», гучалі вершы і песні аб восені. Дзецям спадабаліся гульні «Прадоўжы верш» і «Асеннія гукі», а таксама майстар-клас «Розы з кляновых лісцяў».

Арэхаўская ПБ, 17 чал.

**20 кастрычніка**

Члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо» сабраліся ў бібліятэцы на чарговае пасяджэнне, якое прайшло ў фармаце літаратурнай гасцінай «Рандеву с Есениным». Кобрынскія паэты чыталі свае апошнія творы, у тым ліку вершы з эпіграфамі з ясенінскіх радкоў. З аглядкай на паэзію Сяргея Ясеніна прайшоў і ўрок па вершаскладанню.

ЦРБ, 12 чал.

**28 кастрычніка**

Самадзейныя акцёры аматарскага тэатра-студыі «Пирожок» прадставілі гледачам прэм'ерную пастаноўку спектакля «Пирожок против Коронавируса». Зала інфармацыйна-сэрвіснага цэнтра на гадзіну стала тэлевізійнай студыяй. Гумарыстычныя навінавыя нататкі, яркія касцюмы і музычныя нумары падарылі гледачам выдатны настрой. Намеснік старшыні Кобрынскага райвыканкама В. В. Трубчык выказаў словы падзякі артыстам і пажадаў ім творчага росквіту.

ЦРБ, 45 чал.

**29 кастрычніка**

Для бібліятэкараў раёна адбылася прэзентацыя Календара юбілейных і памятных дат у дапамогу планаванню на 2021 год, падрыхтаванага метадыстамі цэнтральнай раённай бібліятэкі. У календары прадстаўлены не толькі юбілейныя даты беларускіх і замежных пісьменнікаў і іх твораў, але і маюцца рэкамендацыйныя спісы сцэнарных матэрыялаў. Каляндар прадстаўлены на сайце бібліятэкі.

ЦРБ, 42 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81